**Занько А.Р.,** *ст. выкладчык*

# НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ РОК-МУЗЫКІ БЕЛАРУСІ (1-Я ПАЛОВА 90-х ГАДОЎ)

Прайшло больш як 40 гадоў, калі на музычнай сцэне з'явіўся рок-н-рол. І на працягу ўсяго гэтага часу найбольш удзячнай яго аўдыторыяй была моладзь. Не адно яе пакаленне фарміравала свой светапогляд, абапіраючыся на «рознакаляровыя ўзоры» гэтай музычнай плыні.

80-я гады сталі пачаткам нараджэння беларускага року. Ствараюцца і робяць першыя крокі шматлікія гурты, адкрываюцца рок-клубы, праводзяцца фестывалі маладзёжнай музыкі. К пачатку 90-х гадоў заяўляе аб сабе рок-н-рол Беларусі. Акрамя вядомых напрамкаў рок-музыкі (hard'n heavy, art-rock, folk-rock, New Wave і інш.), музыкамі з Беларусі робяцца спробы знайсці свае шляхі развіцця (гурты «Мроя», «Спірыт», «ЫЫ», «Камелот»).

Рок-музыка Беларусі 1-й паловы 90-х гадоў развіваецца галоўным чынам у двух напрамках. Першы належыць гуртам, якія спяваюць па-беларуску і абуджаюць у слухачоў нацыянальную свядомасць. Яны прыцягваюць да сябе ўвагу ўсё большых колаў моладзі. Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца гурты «Крама», «Уліс», «Мроя», «Палац», «Дзіва». Другі - небеларускамоўны, дакладней англамоўны і рускамоўны. Асабліва вялікае распаўсюджанне на Беларусі набыў англамоўны рок-н-рол, аб чым яскрава сведчаць і назвы гуртоў: «Seven B», «Helter Skelter», «Rouble Zone» і інш. І гэта не толькі павага да традыцый рок-н-рола, а і спроба пашырыць аўдыторыю слухачоў па-за межамі Беларусі.

Далейшае развіццё рок-музыкі Беларусі залежыць ад стварэння сістэмы шоу-бізнесу:

- з'яўленне музычных тэле- і радыё-каналаў, спецыялізаваных перыядычных часопісаў і газет з іх шматлікімі :Top, Charts, Poll.:.;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- стварэння фірм грамзапісу, якія запісваюць, вырабляюць аўдыёкасеты ці кампакт-дыскі, займаюцца іх продажам і арганізуюць гастролі;

- падрыхтоўкі прадзюсераў, менеджэраў, прамоўтэраў для працы ў гэтай сістэме.

Наспела неабходнасць у стварэнні Цэнтра беларускага рок-н-рола, які змог бы аб'яднаць разнастайныя намаганні шматлікіх прыхільнікаў рок-музыкі (як аматараў, так і прафесіяналаў) і спрыяў яе далейшаму раз-віццю. Сучаснае пакаленне рокераў закладвае падмурак для поспехаў на сусветнай арэне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ